Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Чамярыская сярэдняя школа”

# Віртуальны альбом фальклорна-этнаграфічных твораў

# *“Наша спадчына”*




2022 г.

Ёсць на Брагіншчыне

Маленькая вёска,

Чамярысы - яна завецца,

І слава аб ёй па ўсёй Беларусі нясецца!







*Калі вам хочацца даведацца пра жыццё продкаў, пачынаючы ад далёкага мінулага і да сучаснасці, звярніцеся да народнай творчасці — люстэрка народнага жыцця. Песні і казкі, легенды і паданні, прыказкі і прыкметы, жарты і загадкі…Колькі ў іх глыбокай мудрасці і высокай паэзіі, колькі святла душы нашых продкаў.*




***Чамярыская зямля***
***На легенды і паданні багата.***
***І мы захоўваем іх свята.***
***Колькі чароўнага і загадкавага***
***У іх сукстракаем***
***Спадчыну продкаў не забываем.***

**Верш пра русалак**

У Дняпры русалкі хаваліся -
Прыгожыя дзяўчаты ў іх ператвараліся.
У нетрах глыбокіх яны гулялі,
Хлапцоў маладых да сябе зазывалі.
І калі хто ў русалчыны чары папаўся,
У водах Дняпра ён навек заставаўся.
Вось якія легенды пра русалак у
Чамярысах бытуюць,
Няхай людзі іх пачуюць.



**Легенда “Вернасць каханню”**

Мая бабуля расказвала мне пра русалку, якая ў водах Дняпра плавае. Жыў у Чамярысах у далёкія часы багаты чалавек. І была ў яго адзіная дачка. Звалі яе Ганна. Усё дзяўчына мела, ні ў чым з дзяцінства ёй адказу не было. Падрэсла яна і такой прыгажуняй стала, што ўсе ў акрузе толькі пра яе і гаварылі. Бацька пасаг добры рыхтаваў дачцэ.

Прыязджалі сватацца да яе з Украіны, ды і мясцовыя багатыя паны сватоў засылалі. Але дзяўчына ўсё адказвалася замуж выходзіць. Бацька ж не хацеў прымушаць яе.

На Купалле ў вёсцы гулянне было. Папрасілася дачка ў бацькі пагуляць. Весела было: карагоды вадзілі, песні купальскія спявалі, вогнішча палілі і скакалі праз яго. Захацела і Ганна вогнішча пераскочыць, але доўга не адважвалася. Але моладзь падбардзёрвала яе. Дзяўчына рашылася і скокнула. А па той бок вогнішча яе паймаў хлопец Васіль. Як падняла вочы Ганначка, так і не змагла адвесці ад яго. А Васіль таксама пакахаў дзяўчыну. Да самай раніцы Ганна і Васіль былі разам.



З гэтага вечара пачало разгарацца іх каханне. Але Васіль ведаў, што бацька ніколі дачку замуж за яго не аддасць. Аб гэтым ён і сказаў Ганначцы. А яна рашыла сама з бацькам пагаварыць.

Дзяўчына пайшла да бацькі і стала прасіць дазволу на шлюб з Васілём. Але той яе і слухаць не стаў. Ніколі такім злосным не бачыла Ганначка свайго бацьку. Плакала і прасіла яна, але сваёй згоды на шлюб бацька не даў.

Усю ноч Ганна не спала. І рашыла, што патрэбна ёй уцекчы з Васілём. У той жа вечар яна пра гэта сказала Васілю. Яны дамовіліся, што назаўтра вечарам таемна абвянчаюцца.

Увесь наступны дзень Ганна не знаходзіла сабе месца. А пад вечар пачула, як галосяць ў вёсцы. Стала распытваць у служак сваіх аб тым, што здарылася. Ёй і расказалі, што гэта галосіць маці Васіля і яго малодшыя сястрычкі, бо Васіль ўтапіўся.

Кінулася Ганначка да ракі. Маці Васіля, калі ўбачыла Ганну, пачала крычаць, што гэта паненка вінавата ў смерці яе сына, што гэта пан, бацька Ганны, загадаў яго ўтапіць.

Плачучы, Ганна кінулася да бацькі. А той ёй і сказаў: "Гэта я загадаў яго ўтапіць, каб ён не мяшаў твайму шчасцю. Я прапаноўваў яму грошы, добрую службу, але ён ад маёй прапановы адказаўся. Дык няхай цяпер на дне Дняпра рыб корміць".

Як пачула гэта Ганна, то горка заплакала і кажа бацьку: "Я буду шчаслівая толькі побач з Васілём. Жыць без яго я не буду".

Бацька загадаў служкам зачыніць яе ў пакоях і нікуды не выпускаць.

Але ноччу Ганна праз акно выбралася на вуліцу, накіравалася да ракі, распранулася і зайшла ў ваду. Перахрысцілася тройчы і ціха сказала:"Васілька, мой любы, сустракай мяне!" Ганна ператварылася ў русалку і паплыла.

Гэтае месца Дняпра, дзе ўтапілася Ганна, і цяпер называюць Ганнін круг. Кажуць, што кожны год на Купалле на бераг Дняпра выплывае русалка, якая вельмі падобна на нябожчыцу – Ганну. Яна ўсё шукае свайго Васіля.

***Запісана са слоў жыхаркі вёскі Чамярысы***
***Бабок Алены Радзівонаўны, 1932 г.н.***

**Легенда пра русалку**

Русалак можна ўбачыць на траецкай нядзелі. Яны выходзяць з вады і прасушваюць свае валасы, разгойдваючыся на высокіх бярозах.

У чацвер, перад святам Троіца, быў русалчын дзень. У гэты дзень бацькі не пускалі дзяцей купацца, бо русалкі маглі дзіцяў ваду.

Дзяўчаты пялі вянкі з бярозы, неслі іх на могілкі. На могілках білі вянкамі па крыжах і гаварылі:

*Мы да вас, крыжы, прыйшлі*
*Вам вяночкі прыняслі.*
*Па крыжах мы імі пахлопаем*
*Русалак спалохаем.*
*Каб русалкі дзяўчат маладых не тапілі,*
*Каб тыя спакойна на рэчку хадзілі.*
*У вадзе забаўляліся*
*І русалак не баяліся.*

А потым дзяўчаты ішлі дамоў, надзявалі вянкі на качаны капусты, каб тыя вялікімі раслі.

Маці мая расказвала, што сама з русалкай сустракалася. Была ў яе сяброўка Кацярына. І вельмі прыгожая тая была. Усе хлопцы да яе заляцаліся. Але быў у яе каханы Іванка. Іванка быў адмысловым рыбаком. Такога прыгожага хлопца ў вёсцы не было. І калі на вячоркі прыходзіла гэтая пара, тоналюбавацца на іх не маглі.

Аднойчы паехаў Іванка рыбу лавіць. Рака спакойная была. Налавіў ён шмат рыбы і вяртаўся назад. Але нечакана падняўся вецер, човен перавярнуўся – хлопец утапіўся.

Кацярына з гэтага часу месца сабе не знаходзіла. Пойдзе да рэчкі і абліваецца горкімі слязьмі. Маці мая як ні суцяшала сяброўку, але тая не магла забыцца на каханага.



А аднойчы Кацярына пайшла да Дняпра і не вярнулася. Шукалі яе шукалі, але так і не знайшлі.

Прайшоў час. Аднойчы маці мая пайшла ў шчаўе на бераг Дняпра. А гэта было раніцай, туманам усё наваколле зацягнута. І тут бачыць, як на беразе дзяўчына паказалася. Валасы распушчаныя, у руках вяночак. Прыгледзелася маці – і пазнала ў дзяўчыне сваю сяброўку Кацярыну. Яна ў той жа сукенцы была, у якой пахавалі.

Спалохалася маці, а Кацярына і кажа: “Не палохайся мяне, я ж твая сяброўка. Але я цяпер русалка. Я вельмі шчаслівая, што знайшла на дне ракі свайго Іванку. Разам мы з ім і на гэтым свеце былі і на тым ”. Сказала гэтыя словы і знікла.

***Запісана са слоў жыхаркі вёскі Чамярысы***
***Сніцарэнка Марыі Андрэеўны, 1929 г.н.***



*Дамавікі  жылі ў кожнай хаце,*
*Пра іх расказвалі нам бабулі і маці.*
*Гаспадары жылі з імі ў згодзе,*
*Дамавікоў шанавалі ў народзе,*
*Бо яны аб дабрабыце сям'і дбалі,*
*І гора, і радасці з гаспадаром перажывалі.*
*Вось якія легенды нам расказалі,*
*Калі ў хаце чамярысцаў дамавікі пражывалі.*

**Легенда “Чаму дамавіка трэба шанаваць?..”**

Жыла ў нашай вёсцы  адна сям'я. Нараджаліся дзеткі, якіх бацькі прывучалі да працы. Была і гаспадарка: конь, карова і цялушка, бараны, куры, гусі і іншая жыўнасць. Добра жыла сям'я. Аж суседзі ўсе зайздросцілі.

Гаспадыня была вельмі добрая і працавітая.  Сваім дзецям яна расказвала, што ў хаце жыве дамавічок, які дбае пра дабрабыт сям'і. Яна вучыла дзяцей, каб ўвечары не стукалі, бо дамавічок ўжо адпачываў. Пасля вячэры заўсёды пакідала ежу, каб дамавік сілкаваўся. А калі выпаліць у печы, то вугольчыкі ў пячурцы пакідала, каб дамавічок-старычок  грэўся.

Муж з яе толькі пасмейваўся: ”Ці ты сапраўды верыш у існаванне дамавіка? Навошта дзяцей  прымушаеш у гэта верыць”. Жонка яму адказвала: “Не гняві таго, хто нам дапамагае, бо наклічаш бяду”.

А на Каляды  жанчына розных прысмакаў нарыхтавала і паклала на стале, на покуце, на акне. Мужу гэта не спадабалася. Калі жонка легла спаць, то муж прыбраў усе пачастункі і кажа: “Не хапала, каб такое дабро прападала, не памрэ  твой дамавік”. Лёг спакойна спаць.

Прачнуўся чалавек ад таго, што нешта грукае ў хаце… Устаў і бачыць: ляжаць перавернутыя ўслоны, абрус са стала сцягнуты, міскі на падлозе ляжаць і дзверы на вуліцу адчынены. Гаспадыня таксама паднялася, не можа зразумець, што здарылася. Пытаецца ў мужа, а той і сам не можа даўмець, што ж адбылося. Бачыць гаспадыня, што няма пачастункаў, якія яна дамавіку астаўляла.”Што ж ты нарабіў, – пачала крычаць гаспадыня. – Ты ж дамавіка пакрыўдзіў, дык ён пайшоў з хаты ”. “Не мялі лухту, прыдумала сабе якогасьці дамавіка, звар'яцела зусім”, - агрызнуўся муж.

Раніцай чуе жанчына, што малодшая дачушка стогне. Падышла бліжэй, прытулілася, а дачушка гарачая... Заве яна мужа. Падышоў да дачкі той  і бачыць, што дачушка беспрытомная ляжыць. Рашылі запрэгчы каня, ды

за знахаркай ехаць. Прыйшоў чалавек у хлеў, а конь на ногі не можа падняцца.

Пайшоў да суседа, каня папрасіў. Прывёз знахарку. Тая зайшла ў двор і кажа: “Бяда ў вашай хаце, няма заступніка ў ёй. І ўсякая нячыстая сіла сюды лезе. Цяжка маёй душы ў вашай хаце”. Тут жонка і расказала, што адбылося. Знахарка і гаворыць: “У кожнай хаце жыве дамавік, з ім трэба жыць у згодзе. А вы пракляцце паслалі яму, пачастункаў пашкадавалі, вось ён і адвярнуўся ад вас, а ўся нечысць у хату палезла. І да таго часу ў хаце бяда будзе, пакуль дамавік не вернецца”. Пашаптала яна дачку, Богу памалілася, і гаспадар адвёз яе дамоў.

З гэтага часу пачаліся беды ў хаце: хварэлі дзеці, на полі жыта не налівалася, конь так і не падняўся на ногі, цялушку ваўкі з’елі, курэй ліса пакрала.

Аднойчы па вёсцы хадзіў старац. Зайшоў ён у хату, дзе раней часта супыняўся на начлег, і бачыць, што гаспадары сумныя сядзяць, дзеткі галодныя, у двары жыўнасці ніякай няма. Ад гаспадыні стары і даведаўся пра тое, што адбылося.

А стары і гаворыць: “Дамавіка трэба папрасіць, каб дамоў вярнуўся, тады ў вас ўсё наладзіцца. А для гэтага станьце на парог і скажыце:
- *Прашу, Дамавік, у цябе прабачэння,*
*Вярніся дамоў,*
*Бо жыць без цябе няма ўжо цярпення.*
*Уратуй нашу сям’ю ад няшчасця,*
*Хай зноў паселяцца ў хаце радасць і шчасце”.*

Паслухалі гаспадары старога і зрабілі так, як ён сказаў.
Прайшоў час. І ў хату зноў вярнулася шчасце: дзеткі раслі здаровымі, збожжа добры ўраджай сабралі, гаспадарка таксама наладжвалася.
З таго часу гаспадар дамавіка шануе і ўнукаў сваіх навучае: “Не крыўдзіце тых, хто побач з вамі пражывае”.

***Запісана са слоў жыхаркі вёскі Чамярысы***
***Бабок Алены Радзівонаўны, 1932 г.н.***

**Легенда “Сустрэча з хлеўнікам”**

У доме жывуць дамавікі, а ў хляве – хлеўнікі. Дык вось мой дзед расказваў легенду пра хлеўніка.

Жыў на хутары заможны селянін. Меў ён добрую гаспадарку. І шмат у яго было коней. Коні ўсе прыгожыя, дагледжаныя. І усе коні былі адной масці, светла-карычневага колеру.

А зімой нарадзілася жарабя белага колеру. Гаспадар дзіву даваўся, што такое жарабятка нарадзілася. Падрасло яно, і паставіў гаспадар яго ў хлеў з іншымі коньмі.

Пайшоў раніцай у хлеў, а белае жарабятка мокрае, калоціцца. Вывеў гаспадар яго на вуліцу – жарабятка супакоілася. На наступную раніцу зноў жа жарабя аж успененае стаіць. Корм не бярэ. За некалькі дзён так схуднела яно, што ледзь ногі перастаўляе. Гаспадар ужо не ведаў, што і рабіць.

Стаў ён расказваць пра сваё гора адной жанчыне. Яна яму параіла схвацца ў хляве і паназіраць за коньмі. Так селянін і зрабіў.

Апоўнач бачыць: у хляве з'явіўся стары чалавек нізенькага росту з доўгай барадой. Падыходзіць да кожнага каня, пагладзіць яго, грыву расчэша, сена падкладзе. А затым падышоў да белага жарабяткі і стаў тое біць, корм ад яго забраў, а затым ускочыў наверх і як стаў ганяць жарабя па хляве, што тое ледзь дыхала.



Стрымаў сябе селянін, каб не кінуцца на старога. А той паставіў каня на месца і знік.

Раніцай забраў селянін жарабятка, пераставіў у іншы хлеў. Пайшоў зноў да той жанчыны, якая параду яму дала. Расказаў усё ёй, а яна і кажа: "Жыве ў цябе ў хляве Хлеўнік. Коней адной масці ён любіць, а другой – не. Прадай сваё белае жарабя, бо жыць яно не будзе".

Паслухаў селянін жанчыну і прадаў белае жарабятка. А купіў каня светла-карычневага колеру. Паставіў у хлеў. Схаваўся ноччу і назірае, што ж будзе. Бачыць: прыйшоў стары, абгледзеў усіх коней, пагладзіў іх, грывы расчасаў. Затым да купленага каня падышоў, абышоў з усіх бакоў, пагладзіў яго, корм паднёс і знік.

З гэтага часу ў хляве стала спакойна. Коні раслі здаровымі. І гаспадар бяды больш не меў.

***Запісана са слоў жыхара вёскі Чамярысы***
***Бабок Івана Іванавіча, 1932 г.н.***

**Легенда “Дамавік  у новай хаце”**

Жыла ў Чамярысах сям’я. У сям’і шмат дзетак было. А хаціна маленькая, што няма дзе і павярнуцца. Рашыў чалавек новую хату пабудаваць.

Набыў лесу, папрасіў людзей– і праз паўгода стаяў ужо новы зруб. Хата вялікая, вокны на вуліцу выходзяць. Радуюцца гаспадары, а асабліва задаволены дзеткі, бо ёсць ім дзе разгуляцца.

Перасяліліся ў новую хаціну. Суседзі прыйшлі, каб радасць раздзяліць разам з гаспадарамі. Здаецца, толькі жыві і радуйся.



Але не паспелі гаспадары абжыцца, як пачаліся непрыемнасці: захварэла свіння, а праз тры дні і здохла, на нogі ўпаў конь і рабіць нічога нельга было. Але мала таго, дык у хаце кожную ноч нехта грукаў. Дзеці ноч не спяць. А маленькі сын і кажа: “Татка, у нас за дзвярамі нехта стаіць”. Але ніхто дзіцяці не паверыў.

Не было радаснага  жыцця ў новай хаце. Пойдуць начаваць у старую хату, то ўсё спакойна, а ў новай хаце і дзеці, і гаспадары дрэнна сябе адчувалі.

А па-суседску старая жанчына жыла. Усе хадзілі да яе за парадамі. Пайшоў і гэты чалавек. Расказаў усё. А тая і гаворыць: “Не будзе ў вас спакою, пакуль дамавіка са строй хаты ў новую не возьмеце жыць. Чаму ж вы яго там аставілі”. Жанчына дала яму параду: прыйдзі ў старую хату і скажы:”Дамавік-дамавічок, садзіся ў сані і паехалі з намі, у новай хаце з намі жыць і радасці дзяліць. А дзясятага лютага пакладзіце цукеркі ў кут, дзе ікона вісіць. А нож каля кута ніколі не кладзіце, бо дамавік вельмі баіцца вострых прадметаў”.

Прыйшоў чалавек дамоў і бачыць, што на куце нож ляжыць, забраў чалавек нож і пайшоў у старую хату. Пераступіў парог і сказаў: :”Дамавік-дамавічок, садзіся ў сані і паехалі з намі, у новай хаце з намі жыць і радасці дзяліць.”

Палеглі спаць і чакаюць, што зноў грукат-стукат пачнецца. Але ноч прайшла спакойна. Дзеткі вясёлыя падняліся. У гаспадароў аж на душы палягчэла. У гаспадарцы лад пайшоў.

З тых часоў дзясятага лютага ў куток людзі кладуць цукеркі, каб дамавічок падсілкаваўся і парадаваўся. Тады ў хаце будзе лад.

*Запісана са слоў жыхаркі вёскі Чамярысы*
*Шупан Матроны Якаўлеўны, 1930 г.н.*

**Легенда “Адплата”**

Жыла ў Чамярысах калісьці адна сям’я. Працавітыя былі людзі. І быў у іх адзіны сын. Звалі яго Сямён. Хлопчык ні з кім не сябраваў, заўсёды быў пануры. Нават бацькі ніколі не бачылі ўсмешкі на твары хлопца. Калі маці і бацька пачыналі яго вучыць жыць з людзьмі па-людску, то хлопец і слухаць не хацеў.

Калі падрос, то бацькі сталі заўважаць, што сын ходзіць часта ў лес. Як пойдзе з раніцы, то пасля поўначы толькі прыходзіць дамоў.

Бацька рашыў прасачыць за сынам. І як толькі той пайшоў у лес, то бацька за ім падаўся. Сямён прыйшоў у лес, сеў на вывернутае дрэва – і як завые. Бацька аж спалохаўся. Хацеў выйсці да сына, але тут убачыў зграю ваўкоў, якія акружылі Сямёна. Пачалі яны сына аблізваць, лашчыцца да яго. Бацька вачам сваім не паверыў, калі ўбачыў, як сын паратварыўся ў ваўка. Хутка сцямнела, ваўкі пабеглі ў бок вёскі.



Прыйшоў бацька дамоў і жонцы ўсё расказаў. Тая пачала плакаць, не вытрымаў і бацька, таксама слязу пусціў.

Дамоў Сямён прыйшоў толькі раніцай. Мокры ўвесь, ногі брудныя, валасы дыбам стаяць. Пачалі бацькі пытацца, дзе ж ён быў, але сын кінуў на бацькоў злосны погляд і сказаў: “Ваш гэта грэх, а разлічваюся я”. І расказаў ім, што адбылося шмат гадоў назад.

Бацька Сямёна ў маладосці часта хадзіў на паляванне. Аднойчы ён забіў ваўчыцу, якая чакала дзіця. Прынёс ён яе дамоў, аблупіў і сшыў жонцы цёплую вопратку. Тая таксама чакала дзіця. А ненароджанае ваўчанятка выкінуў на вуліцу.

Назаўтра ўвечары чуе Сямён, як каля хаты воўк вые. І так жалобна, што аж мароз па скуры ідзе. Жонка і кажа: “Так жалобна воўк вые, быццам плача”. І так было кожны дзень. Выйдзе чалавек на вуліцу, пакрычыць – воўк і пойдзе. І асабліва выў воўк у тую ноч, калі жонка сына нарадзіла.

Выйшаў чалавек на вуліцу і кажа: “Чаго ты выеш менавіта каля маёй хаты?”. А воўк чалавечым голасам і гаворыць: “Ты маё дзіця загубіў, то я тваё забяру. Можа тады ты адчуеш, як гэта балюча траціць сваіх дзяцей”.

Селянін і забыў ўжо пра гэтае здарэнне, а сын напомніў усё, што адбылося шмат гадоў назад.

Горкімі слязьмі плачуць бацькі. А сын ім і кажа:”Не рабі іншым ліхога і не бойся нікога. Назад страчанага не вернеш”. Сказаў так, ператварыўся ў ваўка і пабег у лес. З таго часу бацькі яго і не бачылі больш.

Толькі ў Піліпаўку старыя заўважылі, як падбяжыць да акенца воўк, паглядзіць у шыбачку і хуценька накіроўваецца ў бок лесу.

*Запісана са слоў жыхаркі вёскі Чамярысы*
*Уласенка Ганны Раманаўны, 1936 г.н.*

**Легенда пра ваўкалака**

Жыў ў вёсцы пан. Вельмі жорскі быў. З людзьмі не ладзіў, а багацце меў незлічонае. Гаварылі, што ўсё багацце ашуканствам нажыта. А яшчэ казалі, што пан ператвараецца ў ваўкалака і цягне ў двор ўсякую жыўнасць, абкрадваючы людзей. Кожны дзень у двары з'яўляліся то цяляты, то авечкі. Людзі на пана працавалі дзень і ноч. Сям'і пан не меў. І вось надумаў ён ажаніцца.

І спадабалася яму дзяўчына адна. Звалі яе Аленка. У сям'і яна была старэйшая, а за ёй яшчэ шасцёра дзяцей. Жыла сям'я Аленкі вельмі бедна. І калі пан прыйшоў сватацца, то бацька даў згоду на шлюб дачкі. А Аленка горкімі слязьмі заліваецца і просіць, каб бацька яе за гэтага пана не аддаваў. Але бацька не змяніў сваё рашэнне, бо пасагу ў дачкі не было, ды і меў надзею бацька, што дачка ў шчасці купацца будзе.

Прыйшоў дзень вяселля. Сабраліся госці, селі за сталы, але радасці не было. Бо гаспадар так злосна глядзеў на гасцей, што тыя і лыжкі не паднеслі да роту. Нявеста баялася вочы на маладога падняць, бо ў яго поглядзе было столькі злосці і жорсткасці, што ў яе аж сэрца ад страху сціскалася.

Разышліся госці, а пан і кажа. Ты кладзіся спаць, а я хутка прыйду. А было гэта пасля дванаццаці гадзін ночы. Выйшаў ён на вуліцу і знік. Гэта насцярожыла Аленку. І на наступную ноч, яна рашыла прасачыць за мужам. Выйшаў той з хаты, а яна за ім. Зайшоў пан за хлеў, перавярнуўся тры разы, ператварыўся ў ваўка і пабег за вёску. У хуткім часе прыносіць барана, пусціў яго ў двор. І паўтаралася гэта кожную ноч.

Рашыла яна бацькам пра гэта расказаць. І калі муж пасля апоўначы знік, то пайшла Аленка да бацькоў. Толькі падыходзіць да двара, а там воўк. Схапіў адзіную авечку і пабег. Аленка так спалохалася, што пачала хрысціцца і чытаць малітву. І ў гэты час воўк спыніўся – і як стала яго калаціць, ламаць, што і авечка змагла ўцячы з яго лап. Выскачыў бацька з ружжом і стрэліў. Воўк упаў. Але на зямлі ляжаў не воўк, а пан. Пасля гэтага ўсе людзі ў вёсцы даведаліся, што пан быў ваўкалакам.



***Запісана са слоў жыхаркі вёскі Чамарысы***
***Малец Ганны Рыгораўны, 1932 г.н.***

**Легенда пра вядзьмарку**

Вадзіліся ў вёсцы Ведзьмакі. Дзед мне расказваў пра адну такую Вядзьмарку.

Меў мой дзед добрую карову. Малака яна шмат давала. Усе суседзі зайздросцілі. Асабліва кума хваліла карову і прыгаворвала: “То ж добрая ў вас кароўка. Столькі малака дае, ды і смачнае якое”. Але неўзабаве заўважыў дзед, што карова хваляваацца пачала. Гаспадыню да сябе не падпускае, б’ецца. Ды і малака стала мала даваць. Прыйдзе з пашы і раве. Сена есці не хоча. Хваляванне ахапіла ўсіх сямейнікаў, што застануцца без карміліцы.



Вечарам аднаго дня пайшоў дзед у хлеў. Бачыць, а карову жонка доіць. Дык ён і гаворыць: ”А я цябе шукаю. Думаў, што ты  да кумы пайшла”. А жанчына ператварылася ў сабаку ды як кінецца на дзеда. А дзед ад прыроды дужы быў, метраў пад два ростам. Ухапіў ён сабаку за лапы і гаворыць: “Дык вось хто маю карову доіць ды палохае. Зараз я табе пакажу”. Узяў дзед сякеру, паклаў лапу на калодку і  сакануў. Сабака  завісчаў і кінуўся прэч.

Назаўтра карова ўжо больш малака дала,  з кожным днём  спакайнець стала. А жонка і кажа: “Штось кумы не відаць. За вадой ужо колькі дзён не ходзіць. Схадзі, муж, праведай”.

Прыходзіць дзед да кумы, а тая з перавязанай рукой. Пытаецца ў кумы: ”Ды што ж з табой, кумка? Дзе ж ты руку параніла?”. А яна не ведае, што і сказаць. Паглядзела на дзеда злосным поглядам і сказала: “Сам ведаеш, дзе параніла”. Тут дзед і здагадаўся, што кума ў вядзьмарку пертваралася. І папярэдзіў дзед яе, каб да іх больш ніколі не прыходзіла. А праз нейкі час яна зусім паехала з вёскі. Казалі, што пасялілася ў лесе.

*Запісана са слоў жыхаркі вёскі Чамярысы*
*Шупан Валянцін Фёдараўна,1938 г.н.*

**Рэгіянальная песня**

Звіняць, звіняць званочкі блізенька
Сядай, сядай, дзеванька, нізенька. – 2 разы

Прыпеў:
Ой, да асыпаецца вішнёвы сад,
Пара табе, дзеванька, на пасад.

А хто ж табе косаньку расчэша?
А хто ж табе сэрданька пацеша?

Прыпеў:
Ой, да асыпаецца вішнёвы сад,
Пара табе, дзеванька, на пасад.

Ой, расчэшуць косаньку дзеванькі.
Ой, пацеша сэрданька міленькі.

Прыпеў:
Ой, да асыпаецца вішнёвы сад,
Пара табе, дзеванька, на пасад.

Матуленька галаваньку прыбярэ,
Бо ўжо стаяць конікі на дварэ.

Прыпеў:
Ой, да асыпаецца вішнёвы сад,
Пара табе, дзеванька, на пасад.